# Канвенцыя Рады Еўропы аб прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту і барацьбе з гэтымі з’явамі
## (Стамбульская канвенцыя)

Стамбульская канвенцыя патрабуе ад краін забяспечваць належную абарону і падтрымку ахвярам гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту, **ставячы іх патрэбы і правы ў цэнтр усіх службаў.**

## Што гэта значыць для пацярпелых?



Сацыяльныя службы, паліцыя, праваахоўная сістэма, службы падтрымкі жанчын і любыя іншыя службы, якія аказваюць падтрымку ахвярам, будуць **усведамляць, якую цяжкую траўму** наносяць ахвярам гвалт у адносінах да жанчын і хатні гвалт.



**Доступ да спецыялізаваных службаў падтрымкі,** такіх як крызісныя цэнтры для ахвяр згвалтавання, жаночыя прытулкі і цэнтры псіхалагічнай кансультацыі, аблягчае і паскарае працэс выздараўлення ахвяр і забяспечвае ім **магчымасць рэалізацыі сваіх сацыяльных, эканамічных і юрыдычных правоў.**



Стаўленне да ахвяр, якія перажылі гвалт у адносінах да жанчын і хатні гвалт, **з павагай і спачуваннем** неабходнае для забеспячэння іх выздараўлення, дапамагае іх рэінтэграцыі ў супольнасць і спрыяе пашырэнню іх правоў і магчымасцей у доўгатэрміновай перспектыве.



**Хуткае рэагаванне ў сітуацыях непасрэднай небяспекі і бясплатны канфідэнцыйны доступ да практычных парад, псіхалагічных кансультацый і юрыдычнай падтрымкі** павінны быць забяспечаныя для ўсіх ахвяраў гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту.



**Каб пазбегнуць паўторнага траўмавання ахвяры,** дзяржаўныя ўстановы павінны працаваць у партнёрстве з ахвярамі, якіх яны падтрымліваюць, прыслухоўваючыся і ставячыся з павагай да іх ведаў і асабістага досведу гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту.

WAVE
UN WOMEN
COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L’EUROPE